*Пераможца Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі "Залатая Літара"*

MCMXL

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

# ГРОДЗЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1986 года

Выходзіць адзін раз на месяц

№ 5 (495)
21 мая 2020 года

Распаўсюджваецца бясплатна




## ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ

АФІЦЫЙНА

**Беларусь памятае!**

Віртуальная акцыя "Дарогамі Перамогі" прайшла ў ГрДУ імя Янкі Купалы

Стар. 2

75 ГОД ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

**Загартаваная вайной**

Успамінамі аб ваенным дзяцінстве падзялілася выпускніца Гродзенскага педінстытута Тамара Карэнка

Стар. 4-5

*ВУЗелок*

**Праект "Дзень Перамогі ў памяці пакаленняў"**

Гісторыі студэнтаў-купалаўцаў аб героях сваёй сям'і, удзельніках вайны

Стар. 7

Афіцыйна

# Беларусь памятае!

**Сёлета ў межах рэспубліканскай акцыі "Беларусь памятае. Памятаем кожнага", прысвечанай 75-годдзю Вялікай Перамогі, Купалаўцы ажыццявілі праект "Дарогамі Перамогі" і віртуальна наведалі мясціны баявой славы Гродзеншчыны.**

Дзеля захавання памяці аб героях Вялікай Айчыннай вайны студэнты-купалаўцы пры падтрымцы ўпраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і аддзелаў культуры раённых выканкамаў Гродзенскай вобласці правялі акцыю, прымеркаваную да святкавання Вялікай Перамогі.

Універсітэцкая акцыя "Дарогамі Перамогі" ўпершыню была праведзена па ініцыятыве студэнтаў-купалаўцаў у мінулым годзе. Тады моладзь наведала за два дні пяць раёнаў вобласці, жыхарам якіх яна прадставіла сваю музычна-мастацкую праграму. Працягам акцыі стаў фільм аб вызваленні тэрыторыі Гродзенскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У гонар 75-гадовага юбілею Вялікай Перамогі студэнты вырашылі стварыць тэматычны відэафільм, у які ўвайшлі як фрагменты тэатралізаванай праграмы, так і відэаролікі, падрыхтаваныя прадстаўнікамі моладзі розных раёнаў вобласці на фоне памятных мясцін.

– *Праект "Дарогамі Перамогі" ў гэтым годзе студэнты вырашылі правесці ў іншым фармаце*, – расказала падчас прэзентацыі фільма рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Кітурка. – *Яны расказалі ў адным фільме аб слаўнай гісторыі вызвалення нашай Гродзеншчыны. Хачу выказаць падзяку маладому купалаўскаму пакаленню, якое стала ініцыятарам гэтага цудоўнага праекта пад назвай "Дарогамі Перамогі". Вельмі важна захаваць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. Пакуль мы помнім аб тым, праз якія выпрабаванні давялося прайсці нашым дзядам і прадзедам, мы цэнім тую магчымасць мірна працаваць і спакойна жыць, што ёсць цяпер у нас.*

Падчас прэзентацыі віртуальнай грамадзянска-патрыятычнай акцыі "Дарогамі Перамогі" начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч адзначыла, што гэта ўнікальны праект, які рэалізуецца ў межах рэспубліканскай акцыі "Беларусь памятае. Памятае кожнага", прысвечанай 75-годдзю Вялікай Перамогі.

– *Мы павінны помніць пра пераможцаў, пра нашых ветэранаў, пра тых, хто не вярнуўся з поля бою падчас вызвалення нашай вобласці. У кожным раённым цэнтры ёсць свае памятныя мясціны, як і ў кожнай сям'і ёсць гісторыі, звязаныя з той далёкай вайной. Але мы сапраўды памятаем кожнага. І, дзякуючы ў тым ліку і такім цудоўным ініцыятывам студэнтаў, гэтая памяць працягвае жыць*, – адзначыла Алена Клімовіч.

Удзельнікі акцыі падзяліліся з прысутнымі сваімі эмоцыямі і расказалі аб тым, як стваралі фільм.

– *Было вельмі цікава працаваць над фільмам*, – расказала студэнтка ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Пашынская. – *Мы дзяліліся сваімі ідэямі з моладдзю розных раёнаў вобласці і змаглі пачуць шмат цікавых гісторый, рэальных гістарычных фактаў аб падзеях таго далёкага часу. Гэта незабыўны вопыт. Ужо думаем над тым, якія ідэі рэалізаваць у наступным годзе. Праект "Дарогамі Перамогі" будзе мець працяг.*

У межах акцыі была арганізавана анлайн-сустрэча з прадстаўнікамі некалькіх раёнаў Гродзенскай вобласці. Яны расказалі, як захоўваюць памяць аб вайне, падзяліліся сваімі ўражаннямі ад удзелу ў праекце Купалаўцаў і павіншавалі ўсіх са святам. Скончылася сустрэча сумесным выкананнем песні з кранальнымі словамі, якую ведае кожны, – "Дзень Перамогі".

**Таццяна БАРАНОЎСКАЯ.**
**Кадры з фільма, створанага ў межах акцыі "Дарогамі Перамогі"**













В ГрГУ состоялась акция «Великой Победе посвящается!», приуроченная 75-летию Великой Победы

Свята

# Каштоўная ўзнагарода

**Рэктару ГрДУ імя Янкі Купалы Ірыне Кітурка ўручаны юбілейны медаль "75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне".**

Са святам Вялікай Перамогі рэктара Ірыну Кітурка і ўвесь калектыў універсітэта павіншаваў ваенны камісар Гродзенскай вобласці Вячаслаў Раманенка:

*– Вось ужо 75 год мы жывём на мірнай зямлі дзякуючы нашым ветэранам, партызанам, усім, хто аддаў сваё жыццё і маладосць, абараняючы сваю краіну, свой дом. Сёння ў нашых руках знаходзіцца памяць, якую мы павінны перадаць моладзі, зрабіць усё магчымае, каб яна ведала сваю гісторыю, шанавала яе і несла адказнасць за будучыню краіны.*

У лютым 2020 года Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў падпісаны загад №51 аб зацвярджэнні юбілейнага медаля "75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне". Ён уручаецца ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, вязням канцлагераў, вайскоўцам Узброеных Сіл і іншым службовым асобам, якія прымаюць актыўны ўдзел у патрыятычным выхаванні моладзі, працы з ветэранамі, а таксама ў падрыхтоўцы і правядзенні святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю Перамогі. Сёлета ўсяго было ўручана каля 1000 медалёў ветэранам, а рэктар Купалаўскага ўніверсітэта Ірына Кітурка стала адной з першых, хто ў Гродзенскай вобласці ўшанаваны такім памятным знакам.

*– За гэтай узнагародай стаяць намаганні ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў, якія не толькі адгукаюцца на прапанаваныя мерапрыемствы і акцыі, але і самі з'яўляюцца іх ініцыятарамі. З нагоды 75-годдзя Перамогі хачу яшчэ раз падзякаваць нашым студэнтам, якія арганізавалі такую цудоўную акцыю "Дарогамі Перамогі" і падрыхтавалі фільм пра памятныя мясціны Гродзенскай вобласці, дзе праходзілі баі,* – адзначыла рэктар.

Ірына Кітурка падкрэсліла, што медаль для яе каштоўны і ўнёскам у мірнае жыццё прадстаўнікоў яе сям'і:

*– Мой дзядуля загінуў у студзені 1945 года пад Кёнігсбергам. Мая бабуля засталася пасля вайны адна з шасцю маленькімі дзецьмі. Нам усім трэба вучыцца разуменню каштоўнасці жыцця ў нашых ветэранаў.*



Рэктар падзякавала ваеннаму камісарыяту за супрацоўніцтва і пажадала ўсім толькі мірнага неба над галавой, захаваць памяць пра вайну, подзвігі і перадаць яе моладзі.

**Марыя ПАНІЧАВА,**
**Фота Кацярыны СЯРЖАНТАВАЙ**

# Гонар і слава

**Святочнае мерапрыемства ў межах абласной акцыі "Сімвал гонару і славы" прайшло ў самым "сэрцы" ГрДУ імя Янкі Купалы – на Плошчы ўніверсітэцкага сцяга 10 мая.**

З прывітальным словам да ўдзельнікаў мерапрыемства – супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта – звярнулася рэктар універсітэта Ірына Кітурка:

*– Герб, сцяг і гімн – гэта тое, што ўвасабляе незалежнасць нашай краіны. Ад усёй душы віншую нас усіх з гэтым святам і ганаруся тым, што мы адзіны ўніверсітэт у Гродне, які мае такое цудоўнае і ўнікальнае месца – Плошчу ўніверсітэцкага сцяга. Для Купалаўскага ўніверсітэта сённяшняя акцыя азначае зараджэнне новай традыцыі.*

Ірына Фёдараўна падкрэсліла сімвалічнасць таго, што сёлета Дзень Дзяржаўнага герба і сцяга Рэспублікі Беларусь адзначаецца ў дні святкавання 75-годдзя Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Ад імя студэнтаў у гэты дзень са словамі віншавання выступіла студэнтка педагагічнага факультэта Таццяна Шчэрбач. Яна адзначыла, што для моладзі вельма важна помніць гісторыю свайго народа, сваёй краіны і сям'і, а таксама перадаць яе сваім дзецям.

Ганаровым правам вынасу і падняцця Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь удастоены найлепшыя студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ўніверсітэта, якія сваімі высокімі дасягненнямі ў галіне навукі, культуры і адукацыі ўслаўляюць ГрДУ імя Янкі Купалы ў Беларусі і далёка за яе межамі.

Кульмінацыяй акцыі стала падняцце сцяга Рэспублікі Беларусь на Плошчы ўніверсітэцкага сцяга, пасля чаго кожны ўдзельнік выпусціў у неба паветраныя шары – колеру дзяржаўнай сімволікі.

**Марыя ПАНІЧАВА,**
**Фота Кацярыны СЯРЖАНТАВАЙ**



Руководство университета приняло участие в возложении цветов к памятнику погибшим в годы войны

Конкурс

**Газета "Гродзенскі ўніверсітэт" – пераможца XVI Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі "Залатая Літара" ў намінацыі "Лепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі" па выніках працы ў 2019 годзе.**

Сёлета на конкурс было пададзена 400 заявак перыядычных выданняў, інфармацыйных агенцтваў і персаналій. З іх 269 – рэгіянальных СМІ ад 81 рэдакцыі, 108 заявак рэспубліканскіх СМІ ад 31 рэдакцыі, карпаратыўных – 23. Прыемна, што журы адзначыла не толькі актыўнасць друкаваных сродкаў масавай інфармацыі і сеткавых выданняў, але і высокі ўзровень прадстаўленых работ.

Газета "Гродзенскі ўніверсітэт" упэўнена канкурыруе з раённымі, гарадскімі, карпаратыўнымі і шматтыражнымі друкаванымі СМІ – упершыню ўзнагароду ў той жа намінацыі яна атрымала ў 2017 годзе. Нацыянальны конкурс друкаваных сродкаў масавай інфармацыі "Залатая Літара", арганізатарам якога з'яўляецца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, садзейнічае развіццю друкаваных СМІ Беларусі, актуалізуе значныя тэматычныя накірункі іх дзейнасці па рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, садзейнічае павышэнню прафесійнага і ідэйна-змястоўнага ўзроўню газет, стымулюе творчую дзейнасць журналістаў і іншых творчых супрацоўнікаў, што заняты ў працэсе вытворчасці друкаваных СМІ.

Святочная цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў і ўручэнне дыпломаў і памятных знакаў-сімвалаў адбудзецца ў межах мерапрыемстваў Міжнароднай спецыялізаванай выставы "СМІ ў Беларусі".

*Дзякуй чытачам газеты "Гродзенскі ўніверсітэт", якія натхняюць на плённую працу!*

75 год Вялікай Перамогі



# Загартаваная вайной



**Тамара Карэнка, выпускніца факультэта матэматыкі 1956 года, самы сталы дэлегат на I з'ездзе выпускнікоў, прымеркаваным да 80-годдзя Купалаўскага ўніверсітэта**

**Безумоўна, вайна – гэта жудасна! Асабліва, калі праз гэтыя нечалавечыя пакуты праходзяць дзеці. У гады ліхалецця псіхалагічныя і фізічныя раны, хваробы, холад і голад былі іх пастаяннымі спадарожнікамі. Яны неслі свой крыж – ні ў чым не вінаватыя, пазбаўленыя дзяцінства, юнацтва, маладосці. Чым далей у гісторыю адыходзіць гэты час, тым яскравей паўстаюць у памяці сталых людзей драматычныя падзеі, сведкамі якіх яны былі.**

**87-гадовая Тамара Карэнка, якая Вялікую Айчынную вайну сустрэла 8-гадовай дзяўчынкай у вёсцы Вялікая Воля Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці, да дробязей помніць той час, што спыніў яе бясхмарнае дзяцінства. Яе гісторыя – гісторыя ваеннай вёскі вачамі дзіцяці і разам з тым гісторыя чалавека, загартаванага вайной.**

### Абарванае дзяцінства

– Гэта было зусім нечакана. Нават чуткі ніводнай у вёсцы пра вайну не было. Увечары жанчыны і дзяўчаты як звычайна спявалі песні, а раніцай усе пайшлі займацца сваімі паўсядзённымі справамі. Дзесьці ў абед маці папрасіла мяне, як старэйшую сярод чацвярых дзяцей у сям'і, выгнаць кароўку на пашу. Мы ідзём з бабуляй, і раптам яна кажа: "Глядзі, Тамара, самалёты ляцяць!". Я падняла вочы – сапраўды ляцяць, дый так нізка над зямлёй. А пасля адзін з іх штосьці прадаўгаватае скінуў у паветра. Праз імгненне раздаўся моцны выбух, праз некалькі кіламетраў – яшчэ адзін. Як аказалася, немцы тады ўзарвалі два масты праз рэчку Шчару, на беразе якой мы жылі. Жудасны страх апанаваў мяне. Я, калоцячыся, прыбегла дахаты, бачу, бацька ўстрывожаны мітусіцца. Мы хуценька сабраліся і пайшлі да дзядулі, бо толькі ў яго было радыё. Насцярожыліся, слухаем – і тут раптоўна ўрэзваецца голас Левітана: "Фашысцкая Германія напала на Савецкі Саюз. Вайна, таварышы!". Тады я яшчэ не ведала, што маё бясхмарнае дзяцінства ў гэты дзень і скончылася.

Праз два дні вясковых мужчын пачалі забіраць у войска. Памятаю, як на супрацьлеглым беразе Шчары сабралася шмат савецкіх машын з нашымі салдацікамі. На беразе яны спыніліся, бо маста ўжо не было, і пачалі пераходзіць раку. А фізікі яны ж не ведалі, якая вучыць, што ў месцы, дзе рака вузейшая, глыбей і цячэнне больш імклівае. І пабеглі ў тое месца, дзе вузка. Колькі ж іх, бедненькіх, патапілася! Пасля я бачыла, як на паверхні ракі плавалі раздутыя целы.

Хтосьці з нашых мужчын трапіў на лінію фронту, а той, хто не паспеў, – у партызаны падаўся. За сем кіламетраў ад нас, у вёсцы Руда Яварская, стаяў нямецкі гарнізон. Адтуль карнікі часта рабілі вылазкі па бліжэйшых вёсках, і калі даведваліся, што жанчыны дапамагаюць партызанам, вынішчалі вёскі. У суседняй – Вялікай Волі – пазабівалі ўсіх. Наша сям'я ўцякла ў вёску Селішча – да маміных братоў, дзе мы і прабылі да канца вайны. Там больш-менш ціха было, але і туды наведваліся немцы ці паліцаі.

Аднойчы падчас аблавы ўсе жыхары вёскі ўцяклі ў лес, а наша сям'я, дзе гадаваліся малыя дзеці, не паспела. Маці пахавала нас у кусты недалёка ля хаты і прыказала ціха ляжаць. А мне ж цікава паглядзець, што там за немцы такія. Дзеці іх малявалі па-рознаму: і з рагамі, і з хвастом. І я цішком-цішком папаўзла праз кусты памідораў. Не паспела апомніцца, як апынулася перад дулам нямецкага аўтамата. Са страху пачала заікацца: "А-я, а-я…". Маці пачула мой голас і выйшла на абарону, а за ёю ўсе астатнія дзеці. Нас загналі ў хату і загадалі ляжаць на падлозе тварам ўніз. Памятаю, як я ўся калацілася ад страху. Немцы ў гэты час шукалі мужчын паблізу, і калі б каго знайшлі – адразу б нас расстралялі. Але, дзякуй Богу, нікога не знайшлі.

Фашысты і паліцаі прыходзілі ў вёскі не толькі ў пошуках партызан, але і рабаваць – забіралі ўсялякае людское дабро, нават алюмініевыя чыгункі. Мой бацька быў заўзяты пчаляр, меў вуллі. Аднойчы напрадвесні да нас прыйшоў паліцай і кажа: "Дай мёду". Бацька яму растлумачыў, што мёду ў гэты час няма, пчолкі яшчэ не назбіралі. Тады ён загадаў тату даставаць рамкі і паказваць іх. Бацька дастаў адну-другую, а мёду – ні кроплі. "Ах ты сволач!", – разлзлаваўся на гэта паліцай і, уяўляеце, павёў яго на расстрэл. Мы, дзеці, кінуліся за бацькам. Мая малодшая сястра падбегла да паліцая, пачала цалаваць яго рукі і прыгаворваць: "Пусціце татачку, пусціце татачку…". Адзін раз, другі ён яе адшпурнуў, а пасля сказаў: "Чорт іх бяры, усіх расстраляем". І павёў нас у нізіну, дзе яшчэ была вада, сам стаў насупраць, на ўзвышшы, і наставіў аўтамат. Тым часам мама выбегла наперад, стала на калені, падняла ўгору рукі і пачала маліцца. І ведаеце што? Нябёсы яе пачулі! Сэрца гэтага паліцая памякчэла, і ён прамовіў да бацькі: "Добра, жыві, але ведай, сволач, што кожны твой крок будзе адсочвацца". Пасля гэтага выпадку мой тата, які быў атэістам, сказаў: "І ўсё ж такі Бог ёсць!". Прыйшоўшы дахаты, я зразумела, што мы цудам выратаваліся ад смерці. Пасля гэтага паліцаі нас не пакідалі. І вось аднойчы, гэта быў 1944 год, калі ішло вызваленне Мінска з-пад нямецка-фашысkага іга, паліцаям, што знаходзіліся ў Дзятлаве, было таксама загадана пакінуць тэрыторыю. Яны, раз'юшаныя, што трэба адыходзіць, пачалі бесперапынна страляць з мінамётаў па нашай хаце. Шчасце, што мы схаваліся ў бульбяныя ямы! Толькі пясок сыпаўся на нашыя галовы. Было так страшна! Ніколі не забуду той дзень.

Вайна скончылася, але ў снах яна яшчэ доўга прыходзіла. Пасля яе я стала баяцца чалавека больш, чым звера.

XI Студенческая конференция «Искусство в контексте культуры: коммуникативный аспект» пройдёт в ГрГУ

## Сэрца абпалена смагай жыцця



Тамара Карэнка (у другім радзе ў цэнтры) з сябрамі з інтэрната педінстытута

– Не ведаю, што са мной адбывалася – ледзь не паміраю, так хачу вучыцца. Відаць, страчаныя магчымасці за гады вайны моцна штурхалі да навукі. Нішто не было для мяне перашкодай, нават тое, што сярэдняя школа знаходзілася ў раённым цэнтры за дваццаць кіламетраў ад нашага дома, а палову шляху трэба было ісці праз лес.

Вучылася я добра, але больш за ўсё любіла матэматыку. У той год, калі скончыла сярэднюю школу, яшчэ не было падрыхтаваных настаўнікаў. І мяне, як добрую вучаніцу, адправілі выкладаць матэматыку ў малодшых класах. Вы ўяўляеце сабе? Як мне было цяжка! Добра, што гэта хутка скончылася – прыехаў падрыхтаваны настаўнік, і мяне звольнілі.

Так хацелася вучыцца далей, што я паехала паступаць у Мінскі педагагічны інстытут, зразумела ж, на завочнае аддзяленне. Уступныя экзамены здала добра, а вось экзаменацыйны ліст у дзень апошняга экзамена на радасцях здаць забылася. Прыходжу раніцай у інстытут і бачу, што ў спісе залічаных мяне няма. Я да прарэктара, ён пытаецца: "А дзе ваш экзаменацыйны ліст?". І тут я разумею, што ён у мяне ў кішэні. Ніякія слёзы не дапамаглі. Сказалі, прыедзеш паступаць толькі ў наступным годзе. Выратаваў мяне стрыечны брат. Ён параіў завезці дакументы ў Гродзенскі педінстытут. Я так і зрабіла. І цуд – мяне з гэтымі адзнакамі залічылі на дзённае аддзяленне матэматычнага факультэта. Вось так лёс звязаў мяне з гродзенскім храмам навукі. З той пары гэты інстытут стаў для мяне родным.

Праўда, калі тата даведаўся аб залічэнні на дзённае, заплакаў, што не зможа матэрыяльна мяне падтрымліваць. Я жыла толькі на стыпендыю. У той час былі асаблівыя адносіны паміж выкладчыкамі і студэнтамі: яны не толькі спачувалі, але і аказвалі рэальную дапамогу. Так, аднойчы, калі быў зусім крытычны стан, адзін з выкладчыкаў, Іван Ануфрыевіч Ільюшын, нават даў грошы, каб я схадзіла паабедаць. Было няёмка іх браць, але ён сказаў: "Бяры, а са стыпендыі аддасі". Толькі тады я пагадзілася. Як я яму ўдзячна! Тыя грошы мне тады так дапамаглі.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці пасляваеннага студэнцтва, мы не гублялі пачуццё гумару. Запомніла выкладчыка, які не любіў на занятка насіць журнал з прозвішчамі студэнтаў. Гэта Якаў Іосіфавіч Рыўкінд. Цудоўны выкладчык, так добра тлумачыў матэрыял! Пасля тэарэтычнай часткі трэба было замацаваць веды на практыцы. Ён проста ўказваў: "Вы пойдзеце да дошкі". Аднойчы паказаў на мяне. Я так баялася выходзіць, бо ён быў вельмі строгі. Справілася тады з заданнем на выдатна, ён пахваліў і спытаў, як маё прозвішча. Наступным разам зноў маё прозвішча называе. Але ж кожны раз не будзеш аднаго чалавека выклікаць, а прозвішчаў астатніх ён не ведаў. Выйшаў з гэтай сітуацыі так: пачаў выклікаць таго, хто справа сядзіць ад Карэнка, таго, хто злева ад Карэнка, затым – хто сядзеў ззаду ад Карэнка і хто спераду. І вось аднойчы ўсе мае аднакурснікі паўцякалі ад мяне: "Хай цябе халера, Карэнка, каля цябе небяспечна садзіцца". І селі далёка ад мяне, на другі бок. Якаў Іосіфавіч растлумачыў новы матэрыял, паглядзеў на аўдыторыю, шукаючы вачамі, каго выклікаць да дошкі, і, убачыўшы, што я сяджу, як адзінокі слуп у полі, а ўсе астатнія размясціліся далёка ад мяне, шчыра рассмяяўся. З таго часу ён пачаў насіць з сабой журнал.

Скончыла інстытут з дыпломам выдатніка. І ўсё жыццё аддала служэнню дзецям, навучаючы іх матэматыцы.

Нягледзячы на тое, што са студэнцкай пары мінула больш за шэсцьдзясят гадоў, у маім сэрцы па-ранейшаму жывуць цёплыя пачуцці да сваёй альма-матар.

**Гутарыла Таццяна СУШКО.**
**Фота з асабістага архіва гераіні**



Тамара Карэнка (у другім радзе ў цэнтры) з аднакурснікамі ў педінстытуце, 1955 год

***

**Страчанае ціхае і мірнае дзяцінства вылілася ў Тамары Карэнка ў моцную прагу да вучобы, раннюю мэтанакіраванасць і дазволіла выбудаваць выразную шкалу каштоўнасцей.**

***– Я вельмі шчаслівы і багаты чалавек. У мяне ёсць дзве дачкі, унукі, праўнукі. І хочацца толькі аднаго – каб яны ніколі не зведалі таго гора і смутку, якія нясе з сабой вайна. Для мяне Дзень Перамогі – вялікае свята, бо з 9 мая 1945 года людзі толькі пачалі жыць,*** **– адзначыла Тамара Іосіфаўна і распавяла пра нядаўні выпадак, які яе вельмі абразіў.**

**У скверыку, што знаходзіцца побач са шматпавярховым домам, дзе зараз з дачкой жыве Тамара Іосіфаўна, зяць паставіў драўлянае крэсла, каб можна было пасядзець, падыхаць свежым паветрам і палюбавацца прыродай. На наступны дзень крэсла бясследна знікла.**

**Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы ў знак пашаны і прызнання, захаплення смеласцю, цвёрдасцю характару, прагай да ведаў у няпросты пасляваенны час зрабіў падарунак Тамары Іосіфаўне Карэнка – каваную лавачку, якая будзе ўсталявана ў яе скверыку. І няхай адна маленькая справа стане крокам да ажыццяўлення вялікіх спраў.**

В ГрГУ имени Янки Купалы утвердили Корпоративный кодекс университета

Чытаем разам

# Вайна ў творчасці беларускіх пісьменнікаў



**Наўрад ці варта сёння шматслоўна абгрунтоўваць прычыну нязменнай увагі беларускай літаратуры да ваеннай тэмы, настолькі арганічна яна звязана з усімі этапамі развіцця нашага прыгожага пісьменства. Творчасць беларускіх пісьменнікаў у дастатковай меры прадставіла нам не толькі змястоўнае высокамастацкае асэнсаванне Вялікай Трагедыі ўсіх часоў і эпох, але і выразна паказала, у якім шырокім жанравым полі могуць быць асветлены праблемы вайны і міру, захавання жыцця на зямлі. Паказальна, што і змястоўнае, і жанравае рэчышча твораў ваеннай тэмы да сённяшняга дня знаходзяцца ў полі ўвагі многіх даследчыкаў літаратуры.**

Па прызнанні вядучых вучоных-літаратуразнаўцаў, менавіта беларуская літаратура адкрыла свету найбольшую колькасць трагічных і гераічных старонак ваеннай гісторыі.

Важкі старт гэтай тэме задаў класік беларускай літаратуры Максім Гарэцкі. Яго творы сёння ставяцца ўпоравень з тэкстамі такіх сусветна вядомых пісьменнікаў, як Эрых Марыя Рэмарк, Анры Барбюс і іншых.




У беларускай савецкай літаратуры сярэдзіны XX стагоддзя ваенная тэма доўгі час заставалася адной з самых запатрабаваных і актуальных.

Вайна пераможная, маштабная, эпахальная, вайна народаў, франтоў, вайна партызанская адлюстравана ў такіх творах, як "Векапомныя дні" Міхася Лынькова, "Згуртаванасць" Міколы Ткачова, "Брэсцкая крэпасць" Кастуся Губарэвіча, "Канстанцін Заслонаў" Аркадзя Маўзона, "Мінскі напрамак" Івана Мележа. Трэба прызнаць асобае значэнне раманаў "Пошукі будучыні" і "Млечны шлях" Кузьмы Чорнага, якія дайшлі да чытача толькі ў пасляваенныя гады. Творы пісьменніка-класіка сёння можна назваць вяршынным дасягненнем беларускай мастацкай прозы часу вайны. Іх наватарства заключаецца ў філасофскім асэнсаванні пісьменнікам глабальных пытанняў быцця, псіхалагічным аналітызме пры даследаванні чалавека і нацыянальнага характару. Ваенны час разглядаўся ў такіх творах не іначай як час лёсавызначальны, а падзеі, з ім звязаныя, заставаліся векапомнымі.

У канцы 50-х – пачатку 60-х гадоў амаль з дакументальнай дакладнасцю ў літаратуры пачалі паказваць жорсткасць, бесчалавечнасць вайны, пакуты чалавека на вайне, сталі раскрываць далёка не прывабныя карціны вынішчэння ўсяго жывога на зямлі, вытручвання з душ людскіх лепшых пачуццяў, нівеліроўку характараў.

Менавіта на гэты час прыпадае прыход у беларускую літаратуру пісьменнікаў «ваеннага пакалення», якія не толькі перанеслі ў свае творы ўласны ваенны вопыт, але і дапамаглі ўбачыць злавесную пагрозу, якую нёс народам фашызм, пагрозу, якую несла сама па сабе вайна для ўсіх: і для пераможцаў, і для пераможаных. Па-новаму загучала ваенная тэма ў "франтавых" і "партызанскіх" аповесцях Васіля Быкава, празаіка вострага і бескампраміснa-праўдзівага, які адстойваў правa гаварыць пра гераізм радавога байца, простага салдата, на плечы якога і лёг асноўны цяжар вырашэння ваеннага канфлікту.

Пісьменніка цікавіў у першую чаргу не сам гераізм на вайне, а адчуванні чалавека, яго паводзіны ў экстрэмальных сітуацыях, магчымасці чалавечага духу. "Чалавек на вайне" – вось лейтматыў твораў Васіля Быкава "Жураўліны крык", "Трэцяя ракета", "Альпійская балада", "Сотнікаў", "Пайсці і не вярнуцца".

60-70-я гады характарызуюцца ў беларускай літаратуры феерычным усплёскам ваеннай дакументалістыкі. У гэты час з'явілася шмат твораў мемуарнага жанру. Гэта былі дзённікавыя запіскі, развагі і літаратурныя апрацоўкі успамінаў удзельнікаў ваенных падзей. У іх прывабілвала жывая канкрэтыка, рэальнасць дзеяння. Менавіта на гэты перыяд прыпадае выхад кнігі па-сапраўднаму ўнікальнай – мастацкага дакумента часу – успамінаў выжыўшых ахвяр шматлікіх беларускіх Хатыняў – "Я з вогненнай вёскі" Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка, дакументальнай кнігі Святланы Алексіевіч "У вайны не жаночае аблічча".

Актуалізаваліся ў беларускай ваеннай прозе гэтага часу яшчэ два знакавыя ракурсы ў паказе вайны – вайна і дзяцінства, паказ трагедыі беларускіх вёсак, тых, што паўтарылі лёс Хатыні. Знакавае месца ў распрацоўцы першай з названых праблем належыць беларускаму пісьменніку Віктару Казько. Яго аповесці "Высакосны год", "Аповесць пра беспрытульнае каханне", "Суд у Слабадзе»" і раман "Хроніка дзетдомаўскага саду" можна назваць адмысловым цыклам, у якім гучыць самы трагічны і балючы матыў – "апаленае вайной дзяцінства". Творы Віктара Казько маюць ярка выражаную аўтабіяграфічную аснову. Шчымлівым болем прасякнуты тыя старонкі яго твораў, дзе згадваецца пра жорсткія траўмы, што нанесла неакрэплай дзіцячай душы вайна, дзе выяўляецца пакутлівае шуканне юнай асобай адказаў на далёка недзіцячыя пытанні.




У беларускай літаратуры адлюстраваны яшчэ адзін выключна трагічны момант – лёс мірнага насельніцтва, што апынулася на акупіраванай тэрыторыі і супраць якога вялася страшная па сваёй знішчальнай сіле вайна. Не адразу гэта з'ява знайшла сваё мастацкае ўвасабленне ў творах. На тых, хто застаўся пад акупацыяй, спачатку глядзелі як на безабаронных ахвяр, не здольных на гераічнае процістаянне. Але беларускія празаікі змаглі пераканаўча даказаць, што мірнае насельніцтва не прымала пакорліва варожую навалу, а выяўляла мужнае процістаянне, сілу духу, выключную самаахвярнасць. У аповесцях Івана Пташнікава "Тартак", Барыса Сачанкі "Апошнія і першыя", Алеся Адамовіча "Хатынская аповесць" арганічна перапляліся гераічнае і трагедыйнае, выяўляліся яркія і запамінальныя народныя вобразы.

На мяжы 70 – 80-х гадоў, як быццам рыхтуючы аснову для новага этапу гісторыі ваеннай тэмы, з'явіліся кнігі Івана Чыгрынава, якія сёння называюць беларускай эпапеяй пра вайну. Творы гэтага пісьменніка – "Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві", "Свае і чужынцы", "Вяртанне да віны", "Не ўсе мы згінем" – сталі першай беларускай раманнай пенталогіяй, дзе аўтар паказаў выток гераізму і глыбіню трагедыі беларускага народа.

Канец XX стагоддзя ўнёс свае карэктывы ў многія грамадскія і жыццёвыя працэсы. Гэта не прамінула адбіцца і на стане ваеннай тэмы ў літаратуры. Найперш у паказе вайны дакладна праявіла сябе тэндэнцыя да філасофска-інтэлектуальнага асэнсавання падзей вайны як падзей усеагульнага нявечання і разбурэння: зямлі, жытла, людскіх душ. У свядомасці большай колькасці пісьменнікаў вайна стала выступаць як паняцце, што суадносіцца з філасофскай катэгорыяй Зла. А выдучай канцэпцыяй у творах пра вайну становіцца сцвярджэнне абсалютнай каштоўнасці чалавечага жыцця. Важную ролю ў станаўленні новага этапу ваеннай прозы адыгралі аповесці Алеся Адамовіча "Карнікі", "Нямко", творы Васіля Быкава "У тумане", "Сцюжа", "Пакахай мяне, салдацік" і іншыя.




Аддаленасць ваенных падзей у часе на мяжы XX – XXI стагоддзяў выклікала ў літаратуры новую з'яву – змяншэнне твораў пра вайну. Старэйшае пакаленне, тое, што памятала вайну, пакрысе зыходзіла, саступаючы месца ў літаратуры новым аўтарам. Але маладыя пісьменнікі не спяшаліся брацца за асэнсаванне складанага матэрыялу ваенных часоў, магчыма, адчуваючы перад ім сваю высокую адказнасць.

Тым не менш на навейшым этапе літаратуры пачатку XXI стагоддзя ваенная тэма не знікла. Магчыма, яна саступіла свае пазіцыі ў прозе, але яе прысутнасць у літаратуры падтрымліваюць іншыя жанры. Агляд набыткаў беларускіх пісьменнікаў у XXI стагоддзі засведчыў, што тэма вайны знайшла сваё яркае мастацкае выяўленне ў паэзіі, драматургіі і ў творах паэмнага жанру. П'есы пра вайну Алены Паповай "Бліндаж", Мікалая Рудкоўскага "Дажыць да прэм'еры" працягнулі лепшыя традыцыі пісьменнікаў-папярэднікаў і сцвердзілі новыя тэндэнцыі ў развіцці абазначанага напрамку.

У паэмах беларускіх пісьменнікаў Васіля Макарэвіча "Хатынь" (Полымя, 2013, №3) і Сяргея Давідовіча "Хатыні вечныя званы" (Полымя, 2015, №5) працягнута мастацкае асэнсаванне вобразу вогненнай вёскі. Нягледзячы на тэматычную блізкасць, кожная з паэм прадстаўляе адмысловы ракурс выяўлення трагедыі, укладзены ў сваю жанравую форму. Абодва пісьменнікі спрабуюць засяродзіць увагу сваіх суайчыннікаў на эпахальным канфлікце: сутыкненні сапраўды гуманістычных, маральных пачаткаў з сіламі зла, якія пагражаюць існаванню ўсяго жывога на зямлі.

Асвятленне падзей вайны ў мастацкай практыцы беларускіх пісьменнікаў праходзіла ў настойлівых пошуках, у імкненні зразумець і спасцігнуць усю паўнату чалавечых адчуванняў у суровых умовах выпрабавання фізічных і духоўных сіл. І разам з тым варта згадаць меркаванне прызнанага пісьменніка, літаратуразнаўцы, ураджэнца Гродзеншчыны Міколы Арочкі: *"Памяць вайны настолькі арганічна ўвайшла ў самасвядомасць народа, што да яе мастацкага ўвасаблення сёння творча далучаны ўсе пакаленні"*. З думкай даследчыка хочацца згадзіцца, бо прыведзеныя прыклады твораў беларускіх пісьменнікаў, што не абмінулі сваёй увагай адну з трагічнейшых тэм літаратуры – тэмы вайны – і па-майстэрску ўвасобілі яе ў сваёй мастацкай творчасці напраўду даказваюць, што для творцаў розных пакаленняў гэта тэма застаецца актуальнай, нягледзячы ні на якую часавую аддаленасць.

**Святлана ТАРАСАВА,**
**старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі,**
**член Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

# ВУЗелок

*Шаноўныя студэнты!*
*Запрашаем вас да ўдзелу ў праекце*
*"Дзень Перамогі ў памяці пакаленняў".*
*Тут кожны можа падзяліцца гісторыяй сваіх родных, знаёмых,*
*лёс якіх быў звязаны з Вялікай Айчыннай вайной.*
*Калі вы хочаце, каб подзвігі вашых герояў сталі вядомымі шырокай аўдыторыі,*
*дасылайце свае матэрыялы на нашу пошту*
*grod_univ@grsu.by*



Мой прадзед ніколі не быў героем кніг, але яго імя заўсёды будзе гарэць у сэрцах родных і блізкіх. Вялікая Перамога ў нашай сям'і – гэта свята ўдзячнасці, гонару і слёз на вачах. Колькі такіх герояў, пра якіх мы можам проста памаўчаць! Памаўчаць, бо гаварыць пра іх павінна душа. Зараз, калі мы ставім кветкі не ў вазу ля вакенца, у якім заўсёды нас сустракаў добры і чысты погляд прадзеда, а кладзём іх на халодную мармуровую пліту, верым, што нас нічога не раздзяляе. Героі не паміраюць, яны становяцца анёламі і жывуць у нашых сэрцах. Родныя і блізкія жывыя, пакуль памятаюць пра іх. А памяць пра героя нашай сям'і – Івана Іосіфавіча Касперку, будзе жыць вечна.

Мой прадзед – ветэран!
І я тым ганаруся!
Час – няўмольны тыран!
Дзеда страціць баюся!
Кожны раз пры сустрэчы
Усё больш прыкмячаю:
Пастарэў… Апусціліся плечы,
А ў душы ўсё болей адчаю…
Ён не можа згадзіцца,
Што ўжо сілы не тыя.
Ногі часта падводзяць.
Дзе ж вы, годы ліхія?!
Гляну ў вочы дзядулі –
Сум і жаль прабірае…
Колькі вынес нягод!
Ён адзін толькі знае…
41-ы… Вайна зруйнавала ўсе планы,
Дом не дабудаваны,
Матуля ў слязах,
Сыночак у войска забраны.
Незнаёмыя сцежкі… Дым…
Бомбы… Пажары…
Страшэнныя стрэлы… І смерці…
Як вынесці гэта
Юнаку маладому?!
Ён вынес…
І ў 45-м вярнуўся дадому.
На ўскраечку вёскі
Маці сустрэла.
За чатыры гады яна так пастарэла…
Бацькі не стала…
Хата згарэла.
І радасць адна –
Зямля ўцалела!
А з ёй і надзея
На заўтрашні дзень!
Пры кожнай сустрэчы
Гляджу на дзедавы рукі:
Колькі зрабілі яны,
Каб былі шчаслівымі ўнукі!
Мой прадзед – ветэран!
І я тым ганаруся!
Час – няўмольны тыран…
Дзеда страціць баюся…

**Анастасія БЫЛЕЎСКАЯ,**
**студэнтка 2 курса факультэта эканомікі і кіравання**

Для меня 9 Мая не простой праздник. Я его считаю святым. Потому что 75 лет мы живём мирно, радуемся каждому дню. А всему этому мы обязаны людям, чья кровь проливалась на поле брани с 1940 по 1945 год.

В этой войне принимал участие мой прадед Александр Антонович Карпуть. Он был сапёром 40-й танковой бригады I Белорусского фронта с июня 1941-го по май 1945. В десяти километрах от Берлина 16 апреля 1945 года он был тяжело ранен в кисть руки. Из материалов наградного листа известно, что кроме медали «За победу над Германией» он был награждён орденом Красной Звезды и медалью «За отвагу». В конце мая 1945-го прадед вернулся домой. Занялся сельским хозяйством, построил дом, вырастил пятерых детей. Интересно, что его сын, мой дедушка, родился 9 мая 1941 года. Прадеда считаю не только героем, но и победителем в этой войне.

Современная молодёжь не должна забывать подвиги своих дедов и прадедов. Ведь всё может повториться. Обидно, когда люди отступают от веры, забывают праздники, переписывают историю, то, какой ценой добыта наша победа в Великой Отечественной войне. Беларусь, приняв удар врага, потеряла в кровопролитной войне каждого третьего гражданина. Как сказал наш Президент Александр Григорьевич Лукашенко, «Беларусь – памятник войне…». Наша страна выстояла в этой великой и жестокой схватке. Хочется добавить, что солдаты-победители не только уничтожили мировое зло – фашизм вместе с нацизмом, но и одержали победу жизни над смертью.

**Алексей ЛАРИН,**
**студент 2 курса факультета истории, коммуникации и туризма**



В ГрГУ назвали победителей II Республиканского молодежного фестиваля-конкурса «МЕДИАСФЕРА-2020»

Память

# Война в судьбах Купаловцев




**Великая Отечественная война... Она оставила свой след в каждом населённом пункте, в каждой семье, в том числе Купаловской. Всё дальше уходят в прошлое огненные годы войны, всё меньше остаётся живых свидетелей тех лет. Собирая по крупицам сведения о каждом сотруднике-участнике военных действий, университет бережно хранит и передаёт следующим поколениям память о подвиге своих героев, трудностях испытаний и напряжённом состоянии тех суровых дней.**

Кандидат исторических наук, доцент кафедры истории Беларуси, археологии и специальных исторических дисциплин ГрГУ имени Янки Купалы Андрей Гецевич представил читателю свою книгу о судьбах сотрудников университета в годы Великой Отечественной войны. Выход книги приурочен к 80-летию Купаловского университета и 75-летию Великой Победы.

Идея создания книги «Великая Отечественная война в судьбах сотрудников Купаловского университета» появилась около десяти лет назад, когда страна и университет готовились к празднованию 65-летия Великой Победы. К тому моменту, как отметил автор, уже было собрано немало сведений о преподавателях, участниках военных действий:

*– Однако кроме преподавателей, которые после войны пришли в студенческую аудиторию, за мирную жизнь боролись и те люди, которые впоследствии стали работниками отделов университета, библиотеки, хозяйственных подразделений, комендантами общежитий. О них мы не знали почти ничего. Некоторые работали в университете недолго, но о них сохранились сведения в архивах, музеях. Эти люди также стали героями книги.*

Автор кропотливо работал в архивах с документальными источниками. В книгу включены автобиографические данные, информация из наградных документов, а также сохранившиеся воспоминания не только самих героев, но и их близких родственников, коллег, студентов, сослуживцев. Они воевали на основных фронтах Отечественной войны, партизанских отрядах, спасали жизни в блокадных городах, а также принимали участие в войне с Японией и Финляндией. Некоторые проживали на временно оккупированных врагом территориях и вступили в ряды Красной Армии в последний период войны. Есть среди героев книги и малолетние узники немецких концлагерей, которые, пройдя через тяжелые испытания в юном возрасте, нашли в себе силы для созидательного труда в мирное время, стали педагогами и на протяжении многих лет работали в стенах Гродненского государственного университета имени Янки Купалы.

Всего в издании содержится информация о 94 работниках университета, которые прошли тяготы военного лихолетья. На сбор и обработку материала у автора ушло около двух лет. А благодаря поддержке руководства книга вышла в свет и стала своеобразным подарком ветеранам университета и их родственникам к юбилейной дате.

*– Книга «Великая Отечественная война в судьбах сотрудников Купаловского университета» – это дань уважения и благодарности людям, которые 75 лет назад отстояли независимость родной земли,* – отметил Андрей Гецевич.

Издание адресовано широкому кругу читателей, прежде всего, школьной и студенческой молодёжи, а также всем, кто интересуется историей родной страны, Гродненщины и Купаловского университета.

Материалы книги о судьбах сотрудников Гродненского государственного университета имени Янки Купалы в годы Великой Отечественной войны можно найти на сайте университета. В специальной рубрике, посвящённой 75-летию Великой Победы, регулярно появляются публикации о героях книги Андрея Гецевича «Великая Отечественная война в судьбах сотрудников Купаловского университета».

# Помним, ценим, равняемся



**Победителей олимпиады «Открываю мир педагогических профессий» назвали в ГрГУ имени Янки Купалы. Конкурс объединил учащихся школ 7–11 классов, а также колледжей Гродненской области. Всего в этом году ребята представили 48 работ, 13 из которых посвящены теме Великой Отечественной войны.**

Особенностью традиционной олимпиады, которая прошла на педагогическом факультете ГрГУ имени Янки Купалы в преддверии празднования 75-летия Великой Победы, стало включение конкурсных работ по теме «Учителя-герои Великой Отечественной войны: помним, ценим, равняемся». Это направление исследования вызвало у участников неподдельный интерес. Представленные на конкурс работы были посвящены учителям, чей подвиг нельзя забыть, чьи имена нельзя предать забвению.

Победители определялись в четырёх категориях среди учащихся: 7–8 классов, 9–10 классов, 11 классов, а также средних специальных учреждений образования.

По словам представителя оргкомитета олимпиады и члена жюри, доцента кафедры педагогики и социальной работы Ольги Солдатовой, каждая работа, представленная на конкурс, обладала ценностью, в первую очередь с позиций тех чувств и переживаний, которые испытывали учащиеся при разработке проекта. С трепетом и гордостью участники олимпиады повествовали о героизме своих прадедов.

Так, **Марк Перцев**, дипломант олимпиады среди учащихся 11 классов, не позволил предать забвению героические поступки своей прабабушки Веры Григорьевны Лятецкой, активной участницы партизанского движения, впоследствии ставшей талантливым педагогом. Для спецгруппы «ГРИБ» она собирала разведданные – проникала туда, куда не смогли бы попасть мужчины. С собой везде брала маленького сына Ивана, несла его на руках – так безопасней, немцы не тронут с ребёнком, – и в случае угрозы и трагического исхода хотела остаться вместе навсегда.

Описывая подвиг Нины Ильиничны Хомко, учителя Верейковской средней школы, которая в годы оккупации, будучи пионеркой, хранила священную реликвию – пионерское знамя, **Дарья Карвацкая**, дипломант олимпиады среди учащихся 7–8 классов, для отражения величия подвига учителя приводит известные строки Николая Алексеевича Некрасова: «Учитель, перед именем твоим позволь смиренно преклонить колени…».

Победителем в категории среди учащихся средних специальных учреждений образования стала **Дарья Мелецкая**, учащаяся Волковысского колледжа ГрГУ имени Янки Купалы, представив проект по теме «Учителя-герои Великой Отечественной войны: помним, ценим, равняемся». Дарья исследовала деятельность белорусских учителей на фронте. Обосновывая значимость деятельности педагогов-фронтовиков, она проводит параллель с главным героем произведения В. Быкова «Сотников»: «В нашей работе мы расскажем о тех, кто пошёл путём Сотникова. В Беларуси таких людей много, но знают о них мало». Автор проекта заглянула в каждую область нашей героической страны, отдав дань уважения истинным педагогам.

С работами победителей в номинации «Учителя-герои Великой Отечественной войны: помним, ценим, равняемся» можно ознакомиться на сайте нашей газеты **gazeta.grsu.by**

**Материалы полосы подготовила Татьяна СУШКО.**

GAZETA.GRSU.BY

**ЗАСНАВАЛЬНІК:**
**УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1083. Выдадзена 21.01.2010 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Падпісана да друку:** 20.05.2020 у 09.00.
**Аб'ём** – 8 друк. арк. **Тыраж** 1000 экз. **Заказ** № 2323.
**ДРУК:** ГАУПП «Гродзенская друкарня», 230025, г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4. ЛП 02330/39 ад 27.03.2014 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
вул. Ажэшкі, 22, пакой 335, 230023, Гродна.
**Тэл.:** 32-02-29. **E-mail:** grod_univ@grsu.by

**Рэдактар:** Сушко Тацццяна Сяргееўна
**Мастацкі рэдактар:** Ботвінка Ганна Уладзіміраўна